Ці забаронена ўвогуле святкаваць у Вялікім посце?

Аўтар: grodnensis.by
07.03.2021 00:00

Урачыстае адзначэнне гадавіны дня нараджэння глыбока ўкаранёна ў традыцыі нашага народу і служыць пабудове сямейных і сяброўскіх сувязей у атмасферы любові ды цеплыні. Аднак ёсць вельмі шмат людзей, чые дні нараджэння, імяніны ці іншыя асабістыя ўрачыстасці прыпадаюць на Вялікі пост. Як жа святкаваць у посце? † 4-ты касцёльны наказ вучыць: “Захоўваць ва ўстаноўленыя дні пост і ўстрыманне ад мясных страў, а ў перыяды пакаяння не ўдзельнічаць у забавах”. Прычым дзеючы ў цяперашні час закон гаворыць аб забавах наогул, не ўдакладняючы, якія яны. Касцёл пакідае на сумленне вернікаў вызначэнне рамак і спосабу перажывання Вялікага посту. Безумоўна, танцы і гучную музыку неабходна выключыць. Варта памятаць, што мэта гэтых наказаў – дапамагчы вернікам у самакантролі і фарміраванні свабоды сэрца.

Дзень нараджэння, падобна як імяніны і розныя гадавіны, з’яўляецца добрай нагодай, каб падзякаваць Богу за атрыманае жыццё і незлічоныя дары. Таму здаецца, што лепшы спосаб адзначыць уласныя святы – гэта, перш за ўсё, малітва, а таксама, па магчымасці, удзел у Эўхарыстыі. Варта ў гэты дзень альбо напярэдадні прыступіць да споведзі, каб з чыстай душой прыняць св. Камунію. Годным для пераймання з’яўляецца таксама замаўленне многімі вернікамі св. Імшы з нагоды важных дат.

Падчас Вялікага посту можна арганізаваць дзень нараджэння ці імяніны, але трэба памятаць пра забарону на ўдзел у забавах. Можна адчуць радасць і без шумнай вечарыны, алкаголю або, па меншай меры, без напівання. У такім выпадку нават ёсць больш магчымасцей для сяброўскіх размоў. Вядома, можна таксама перанесці святкаванне на час пасля Вялікадня.

Акрамя таго, вельмі часта ў перыяд Вялікага посту адзначаецца Жаночы дзень. Як і ў любым іншым выпадку, у гэты дзень вернікі маюць асаблівую нагоду маліцца праз заступніцтва Найсвяцейшай Панны Марыі, апякункі ўсіх жанчын. Безумоўна, не парушым дух Вялікага посту, павіншаваўшы дарагіх сэрцу асоб і з’еўшы кавалак смачнага торта. Аднак удзел у масавых мерапрыемствах, а таксама арганізацыя ў гэты дзень шумнай забавы, звязанай са злоўжываннем алкаголем, з гучнай музыкай і танцамі, несумненна, будзе парушэннем 4-га касцёльнага наказу.

У перыяд Вялікага посту можна сустрэцца з сям’ёй ці сябрамі, схадзіць у тэатр, кінатэатр ці філармонію. Для некаторых людзей, залішне паглынутых паўсядзённымі справамі, такое баўленне часу можа быць нават добрым велікапосным учынкам. Правільнае перажыванне Вялікага посту – гэта не толькі адмаўленні і абмежаванні, але, перш за ўсё, час добрых спраў і самарэфлексіі, малітвы, міласціны, дапамогі бедным і дбайнага выканання сваіх абавязкаў.